УДК 378.4(476.5):73/76:070

# Гісторыя мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава на старонках друку

***Вінаградаў В. Н.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава”, Віцебск*

*У артыкуле прадстаўлены звесткі аб шматлікіх публікацыях, прысвечаных стварэнню ў 1959 годзе і першым гадам працы мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута (універсітэта), што былі змешчаны ў беларускім друку. Прыводзяцца дадзеныя аб прадумовах стварэння ў Віцебску Мастацкага музея, удзеле выкладчыкаў факультэта ў эстэтычным выхаванні моладзі, правядзенні творчых выстаў. Значная ўвага нададзена публікацыям, прысвечаным студэнцкім справам (вынікі экзаменаў, абарона дыпломных работ, арганізацыя выставак і інш).*

*Ужо першыя “крокі” ў гісторыі мастацка-графічнага факультэта не толькі выклікалі вялікую цікавасць грамадскасці, знайшлі адлюстраванне уў рэспубліканскім і абласным друку, але і прадэманстравалі значнасць і высокую запатрабаванасць спецыялістаў, падрыхтоўкай якіх займаўся гэты факультэт. Сродкі масавай інфармацыі звярнулі ўвагу і на факт актывізацыі творчай дзейнасці ў Віцебску, на з’яўленне новай плеяды маладых творцаў, якія ў далейшым сталі сапраўдным гонарам славутай Віцебскай мастацкай школы. Прыкметна, што аўтар гэтага артыкула не толькі аказаўся адным з арганізатараў, заснавальнікаў мастацка-графічнага факультэта, але і прыклаў у канцы 1950 – пачатку 60-х гадоў вялікія намаганні, ужо як журналіст і навукоўца для папулярызацыі яго дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *мастацка-графічны факультэт, чарчэнне, маляванне, творчая выстава, мастак-педагог, графіка, выкладчык, студэнт, дыпломная работа.*

*(Искусство и культура. – 2018. – № 2 (30). – С. 89–94)*

# History of the Art Faculty of Vitebsk State P. M. Masherov University in Mass Media

***Vinagradau V. N.***
*Educational Establishment “Vitebsk State P. M. Masherov University”, Vitebsk*

*Data of numerous Belarusian newspaper articles which dwell upon the foundation (in 1959) and first years of work of the Art Faculty of Vitebsk Pedagogical Institute (University) are presented in the article. The preconditions of establishing the Art Museum of Vitebsk, participation of the Faculty teachers in aesthetic upbringing of youth, conducting artistic exhibitions are shown. Considerable attention is drawn to articles on student affairs – exam results, diploma paper defense, setting out exhibitions etc.*

*First “steps” in the Art Faculty history were not only extremely interesting for the public, found reflection in the Republic and Region mass media but also demonstrated the significance and demand in specialists who the Faculty trained. Mass media also paid attention to the fact of the intensification of artistic activities in Vitebk, to the emergence of a number of young artists who later became the honour of the famous Vitebsk art school. It should be pointed out that the author of the article was not only one of the founders of the Art Faculty but also made great attempts, in the late 1950-s – early 1960-s, to popularize its activities as a journalist and a scholar.*

*Key words: Technical Drawing, painting, Art Faculty, artistic exhibition, artist teacher, engraving, teacher, student, diploma paper.*

*(Art and Cultur. – 2018. – № 2 (30). – P. 89–94)*

У апошнія гады значна павялічылася колькасць публікацый аб гісторыі мастацка-графічнага факультэта. Важкі ўклад у гэту справу уносіць і часопіс “Искусство и культура”, у якім у апошні час з’явіліся артыкулы Ю. П. Бежанар, В. В. Шамшура, М. Л. Цыбульскага, С. В. Кот і іншых. У свой час аўтару дадзенага артыкула давялося працаваць разам практычна з усімі выкладчыкамі, якія прыгадваюцца ў гэтых публікацыях, вучыць і выхоўваць многіх студэнтаў, якія сталі потым вядомымі мастакамі, арганізатарамі мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання моладзі, вучонымі. Усё гэта адпаведны дар мастацка-графічнага факультэта нашаму грамадству, важкі ўнёсак у развіццё мастацтва Віцебшчыны.

Прозвішчы многіх выкладчыкаў, як і звесткі аб некаторых мастацкіх падзеях, прайшлі тады

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: victor.vitebsk@mail.ru – В. Н. Вінаградаў*

Репозиторий ВГУ

праз прэсу – публікацыі ў газетах, часопісах і іншых выданнях. Гэтыя публікацыі – часцінка ўкладу ў гісторыю інстытута (універсітэта) і факультэта, цаглінкі "будынка" добра вядомай зараз Віцебскай мастацкай школы. Аўтару дадзенага матэрыяла ў 1950 – пачатку 60-х гадоў пашчасціла прымаць удзел ў асвятленні працэсу стварэння і работы факультэта – спачатку як выкладчыку, потым – пазаштатнаму карэспандэнту газеты "Віцебскі рабочы", і пасля – як члену Саюза журналістаў СССР.

Мэта артыкула – аналіз аўтарскай навукова-публіцыстычнай практыкі, скіраванай на адлюстраванне этапаў гістарычнага развіцця мастацка-графічнага факультэта на старонках перыядычнага друку.

**Ля вытокаў стварэння мастацка-графічнага факультэта.** Пачынаючы з 1959 года аўтар дадзенага матэрыяла разам са сваёй сям'ёй некалькі год жыў ва ўмоўна называемым "жылым" доме па вул. Грыбаедава (зараз яго ўжо няма) побач з сем'ямі іншых выкладчыкаў – Васілія Рыгоравіча Шаталава, Сямёна Харытонавіча Далматава, Дзмітрыя Паўлавіча Генеральніцкага. А пасля – у адным доме (але на другой вуліцы) з Рыгорам Піліпавічам Клікушыным.

Прадвеснікам неабходнасці стварэння спецыяльнага факультэта трэба лічыць першую публікацыю В. Вінаградава ў "Настаўніцкай газеце" (17 студзеня 1958 г.). Яна называлася "Чарчэнню – належная ўвага". У артыкуле сцвярждалася, што "Віцебскае мастацка-графічнае педвучылішча не ў стане забяспечыць патрэбы рэспублікі ў выкладчыках чарчэння. Да таго ж вопыт паказвае, што выпускнікі гэтага вучылішча стаяць значна ніжэй па свайму адукацыйнаму развіццю за выпускнікоў педВНУ" (да ведама чытачоў – аўтар гэтых радкоў сам выпускнік вучылішча – 1953 года, затым – педагагічнага інстытута (1957 г.). Гэта быў першы артыкул у рэспубліканскім друку аб праблемах падрыхтоўкі выкладчыкаў чарчэння. "Вельмі важна, – азначалася ў артыкуле, – каб у баку ад гэтай справы не засталося Міністэрства асветы, ад яго залежыць вельмі многае"[1].

У некаторай ступені гэта праблема займала таго ж аўтара і ў артыкуле абласной газеты "Віцебскі рабочы" (26 лютага 1958 г.) – "Выкладанне чарчэння ў школах", а затым – у матэрыяле "За высокую графічную культуру" – і ў "Настаўніцкай газеце" (16 мая 1958 г.). Праз некаторы час у газеце "Звязда" (9 снежня 1958 г.) – органе ЦК КПБ, Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР В. Вінаградаў зноў адзначае, што "рыхтаваць настаўнікаў чарчэння трэба ў вышэйшых навучальных установах". З заклікам да вучняў "вывучаць спосабы адлюставання прасторавых прадметаў" аўтар дадзенай публікацыі звяртаецца праз газету "Піянер Беларусі", часопіс "Бярозка" і іншыя выданні.

І вось, як кажуць, – лёд крануўся: "Настаўніцкая газета" (21 ліпеня 1959 г.) змяшчае артыкул "Новы атрад выкладчыкаў малявання і чарчэння". У ім закранаалася пытанне падрыхтоўкі да работы выпускнікоў, вялася размова аб іх агульна-адукацыйным узроўні, але адзначалася галоўнае – "трэба вітаць рашэнне Міністэрства асветы БССР аб стварэнні на базе вучылішча мастацка-графічнага факультэта пры Віцебскім педінстытуце". Цікава, што аўтар гэтых радкоў у той час прысутнічаў на дзяржаўных экзаменах у мастацка-графічным педвучылішчы разам са старшынёй камісіі, вядомым мастаком А. П. Марыксам.

**Першыя крокі "худграфа".** Ужо 9 жніўня 1959 г. віцебская абласная газета ў нататцы "Новы факультэт" паведамляла: "На базе мастацка-графічнага вучылішча пры Віцебскім педагагічным інстытуце створаны мастацка-графічны факультэт. Ён будзе рыхтаваць кваліфікаваных выкладчыкаў малявання і чарчэння для школ рэспублікі. За чатыры гады навучання студэнты дасканала авалодаюць малюнкам, жывапісам, кампазіцыяй, чарчэннем, гісторыяй мастацтваў, методыкамі выкладання. На новым факультэце заканчваюцца ўступныя экзамены"[2]. А "Настаўніцкая газета" (11 верасня 1959 г.) у артыкуле "На новым факультэце" пісала: "Амаль усе студэнты новага факультэта маюць стаж работы на вытворчасці або ў школе. Многія з іх закончылі Віцебскае мастацка-графічнае вучылішча і працавалі настаўнікамі".

Як станоўчую рэакцыю на адкрыццё факультэта газета "Віцебскі рабочы" (18 кастрычніка 1959 г.) друкуе вялікі артыкул В. Вінаградава "Стварыць у Віцебску мастацкі музей". У працяг гэтых думак у газеце "Піянер Беларусі" 23 кастрычніка таго ж года змяшчаецца матэрыял аб збіральніку каштоўных рэдкасцей І. Д. Галькевічу. У абодвух артыкулах лейтматывам становіцца ідэя стварэння музея ў якім можна было экспанаваць, як жывапісныя і графічныя творы Ю. М. Пэна, І. Я. Рэпіна, так і работы тых мастакоў і скульптараў, што вучыліся, ці працавалі ў Віцебску. Мелася на ўвазе і тая акалічнасць, што музей будзе своеасаблівай аудыторыяй для студэнтаў факультэта па гісторыі мастацтваў, аб чым аўтару гэтых радкоў удалося паразмаўляць з былым першым сакратаром абкама партыі У. Е. Лабанком. Ён абяцаў дапамогу. Але ж не было для гэтай мэты належнага памяшкання. Тым не менш аддзел (не музей) мастацтва быў створаны пасля

[1] Менавіта на гэты артыкул спасылаўся тагачасны дырэктар вучылішча А. Н. Салоха, калі пісаў аб неабходнасці рэарганізацыі навучальнай установы.

[2] Аб адкрыцці і пачатку работы факультэта гл. часопіс "ИиК", 2013 г., № 4.

перамяшчэння тэлефоннай станцыі з 3-га паверха будынка музея (а яна была менавіта там) за Дзвіну.

**Справы і праблемы факультэта.** Сродкі перыядычнага друку Беларусі пастаянна ўдзялялі ўвагу дзейнасці мастацка-графічнага факультэта. Так артыкул у газеце “Віцебскі рабочы” (13 студзеня 1960 г.) інфармаваў чытачоў аб экзаменацыйнай сесіі на факультэце. Азначаліся добрыя веды на экзаменах па чарчэнню студэнтаў Жукавай[3], Міхалені, Старасценка і інш., па малюнку – Гарнашэвіча, Дарагакупца... Сёння гэтыя прозвішчы для даследчыкаў гісторыі факультэта і віцебскага мастацтва гавораць аб многім...

У розных выданнях з’яўляліся фотарэпартажы аб новым факультэце, сярод якіх можна прыгадаць артыкул “Наш мастацка-графічны” (газета “Віцебскі рабочы”) і фотарэпартаж, зроблены карэспандэнтам С. Капелька для БелТа (газета “Знамя юности”).

Газета Міністэрства культуры “Літаратура і мастацтва” (“ЛіМ” 19 сакавіка 1960 г.) прыводзіць інфармацыю “Змястоўная лекцыя” – аб выступленні перад студэнтамі дырэктара Беларускага тэатра імя Я. Коласа І. Дорскага. І як адказ на артыкул ў газеце 30.03.1960 г. змяшчаецца матэрыял аб калектыўных наведаннях студэнтамі тэатра з абмеркаваннем спектакля пасля прагляду.

18 ліпеня 1960 г. газета “ЛіМ” інфармуе чытачоў аб адкрыцці ў Віцебскім краязнаўчым музеі аддзела выяўленчага і прыкладнога мастацтва. Зазначаецца гэта як добры падарунак працаўнікам вобласці і студэнтам.

Рэспубліканская “Настаўніцкая газета” (28 верасня 1960 г.) змяшчае матэрыял “На маладым факультэце”, у якім яго аўтар прадстаўляе своеасаблівую справаздачу за першы навучальны год, падае інфармацыю аб рабоце факультэта: матэрыяльнай базе, адукацыйнай і выхаваўчай дзейнасці са студэнтамі. У артыкуле гаворыцца аб плённай працы выкладчыкаў Дзежыца, Клікушына, Генеральніцкага, Сталярова, Гаўрушка, Місюк, Ганчарова, Шаталава, Карнеева, Гудзіновіча. Акрамя таго ў дадзеным матэрыяле як станоўчыя мерапрыемствы на факультэце адзначаюцца сустрэчы студэнтаў з вядомымі мастакамі, арганізацыя творчых выстаў студэнцкіх работ, іх абмеркаванне, дзейнасць гурткоў па скульптуры, лінагравюры і інш.

У сваю чаргу “ЛіМ” (5 мая 1961 г.) зноў звяртаецца да падрыхтоўкі настаўнікаў на факультэце, піша аб дапамозе школам, аб рабоце дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва. 18 мая 1961 г. тая ж газета распавядала аб працы на базе факультэта студыі для самадзейных мастакоў.

Цікавасць (па водгуках многіх настаўнікаў) выклікаў артыкул у газеце “Віцебскі рабочы” (13 мая 1961 г.) “Аб нашых мастаках-педагогах”, дзе апавядаецца аб В. К. Дзежыцу і іншых выкладчыках, што працавалі ў той час на мастацка-графічным факультэце. Вось толькі некаторыя вытрымкі з надрукаванага.

"Першыя пасляваенныя гады ў Віцебску. Аднаўляецца разбураная вайной гарадская гаспадарка. Нішто не міне ў гэты час пільных вачэй мастака. Яго можна было бачыць сярод рачнікоў Заходняй Дзвіны, якія аднаўлялі першы параход «Енісей». З мальбертам у руках ён з’яўляецца ў будаўнікоў драўлянага маста цераз Віцьбу на вуліцы Леніна, сярод рабочых толькі што адноўленай у горадзе хлебапякарні і ў шэрагу іншых месц. Быць ў цэнтры падзеі, бачыць у ёй галоўнае, умець заўважыць тое, што часам не заўважае звычайны глядач, – вось адметная рыса творчасці мастака Дзежыца, якой ён заўсёды верны.

Пасля выстаўкі беларускага выяўленчага мастацтва ў Маскве ў 1935 годзе, дзе была паказана работа Дзежыца «Сустрэчы», мастак удзельнічаў больш, чым у 10 выстаўках у Віцебску, Мінску, Маскве. Яго работы можна бачыць у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР і Віцебскім абласным краязнаўчым музеі. Цяпер мастак працуе ў галіне эстампа. Рэпрадукцыя яго лінагравюры «Над Дзвіной» была нядаўна апублікавана ў часопісе «Беларусь». Свае веды мастак перадае студэнтам. Пад яго кіраўніцтвам у інстытуце працуюць два гурткі графікі.

Двойчы ў выстаўках удзельнічаў І. М. Сталяроў. Некаторыя з яго работ знаходзяцца цяпер у адным з калгасных музеяў на Лепельшчыне.

Цікавую работу выдуць і іншыя мастакі-педагогі. Усе яны імкнуцца прывіць чалавеку пачуцці прыгожага, новага, усе яны ўносяць дастойны ўклад у вялікую справу выхавання насельніцтва"».

Даволі падрабязна аб жыцці, мастацкай і педагагічнай дзейнасці Валянціна Канстанцінавіча Дзежыца пісала “Настаўніцкая газета” (18 сакавіка 1964 г.), калі яму споўнілася 60 гадоў.

16 мая 1961 г. газета “Віцебскі рабочы” пачала апавяд аб студэнцкай творчасці. “Многія студэнты, – гаворыцца у матэрыяле на гэту тэму, – вядуць самастойную работу. Іх малюнкі складаюць змест многіх выставак. Тут паказалі сваё майстэрства студэнты Алонцаў, Маскалькоў, Гумен і інш. Цяпер у памяшканні факультэта экспануюцца работы Марачкіна і Гумена. Характэрна, што кожны з удзельнікаў выстаўкі ўжо мае свой стыль пісьма, сваю манеру”.

Аб выстаўцы студэнцкага плаката вядзецца размова ў артыкуле, змешчаным у “Настаўніцкай газеце” (18 лістапада 1961 г.).

[3] Пасля заканчэння інстытута і працы ў прафтэхвучылішчы Алена Ціханаўна Жукава працавала на факультэце, у апошні час – прафесарам кафедры начартальнай геаметрыі і чарчэння.

Рэпазіторый ВДУ

Выстаўка была арганізавана ў фае віцебскага кінатэатра “Спартак”. На ёй паказаны студэнцкія лінагравюры, акварэлі Гумена, прысвечаныя сталіцы нашай рэспублікі – Мінску. Тэмай некаторых работ з’яўляліся працоўныя будні горада і вёскі, індустрыяльны пейзаж Віцебшчыны.

У вялікім артыкуле “Любіць прыгожае” газета “Віцебскі рабочы” (19 верасня 1961 г.) ставіць пытанне аб удзеле мастакоў у прапагандзе эстэтычных ведаў сярод насельніцтва. Як станоўчы прыклад называюцца прозвішчы выкладчыкаў мастацка-графічнага факультэта – Дзежыца, Генеральніцкага, Зейлерта, Клікушына. Гэтай праблеме прысвечаны і артыкул “Прыгожае – у быт” (“Віцебскі рабочы”, 23 студзеня 1962 г.)

Асобныя газеты далі водгукі аб персанальнай выставе выкладчыка Р. П. Клікушына – “Віцебскі рабочы” (10 снежня 1961 г.), “ЛіМ” (12 снежня 1961 г.), “Настаўніцкая газета” (13 снежня 1961 г.).

Газета “ЛіМ” (9 лютага 1962 г.) надрукавала матэрыял “Дакладчыку ў тэзісы” да VI з’езда мастакоў Беларусі. Яго аўтары – выкладчыкі В. Вінаградаў і Р. Клікушын. Прывядзем толькі некаторыя вытрымкі. “На кафедры малюнку і жывапісу інстытута працуе дзевяць мастакоў-выкладчыкаў, якія не абмяжоўваюць сваю дзейнасць адной выкладчыцкай працай. Арганізацыя выставак для ўсеагульнага агляду, чытанне лекцый у народных універсітэтах культуры і на прадпрыемствах, кіраўніцтва самадзейнымі студыямі выяўленчага мастацтва – усё гэта справа рук нашых мастакоў-выкладчыкаў.

У мінулым годзе педагогі Віцебскага педагагічнага інстытута разам з мастакамі арганізавалі сельскія мастацкія музеі ў двух раённых цэнтрах вобласці, падараваўшы ім некалькі сваіх твораў.

Калектыў мастакоў-выкладчыкаў гатоў яшчэ больш працаваць на карысць грамадскасці, але гэтаму замінаюць некаторыя прычыны, аб якіх і хочацца пагаварыць напярэдадні нашага з’езда”.

Далей у прыгаданым вышэй артыкуле гаворыцца, што “у педагагічным інстытуце на нас глядзяць толькі як на выкладчыкаў і зусім забываюць, што мы яшчэ і мастакі. Гадавая нагрузка кожнага такая, што амаль выключае магчымасць займацца творчасцю. Расклад заняткаў робіцца на факультэце без уліку асаблівасцей нашай творчай працы, выкладчык знаходзіцца амаль увесь дзень у інстытуце, хоць у гэтым часта няма ніякай патрэбы. Ніхто з выкладчыкаў, нават членаў Саюза мастакоў, не мае нармальных умоў для творчай працы з-за адсутнасці спецыяльных майстэрань. Кіраўніцтва інстытута лічыць творчую работу выкладчыкаў іх асабістай справай, а майстэрню для мастака – празмернай раскошай. Ёсць у нас прэтэнзіі і да праўлення Саюза мастакоў БССР. Ці ведае яно, напрыклад, што кіраўнікі Віцебскіх мастацка-афарміцельскіх майстэрань і філіяла Саюза мастакоў (…) стараюцца ўсяляк адгарадзіцца ад нас, бо лічаць мастакоў інстытута «чужымі». Нам цяжка часам набыць неабходны матэрыял для сваёй творчай працы. Загадчык майстэрань (…) адмовіў нам у памяшканнях, дзе можна было б пісаць карціны і графічныя палотны. І ўсё з-за таго, што ў філіяле Саюза мастакоў гавораць: «Гэта не нашы людзі». Тут атрымліваецца нейкая недарэчнасць. Усе мастакі-выкладчыкі пядінстытута маюць спецыяльную вышэйшую адукацыю, два з іх – члены рэспубліканскай творчай арганізацыі, і незразумела, чаму да нас так адносяцца кіраўнікі філіяла.”

Заканчваецца матэрыял пажаданнямі аб неабходнай размове па названых праблемах на з’ездзе і не толькі на ім.

У артыкуле “У майстэрнях мастакоў” (“Віцебскі рабочы”, 21 лютага 1962 г.) распавядаецца аб рабоце вядучых майстроў пэндзля Віцебшчыны ўжо пасля з’езда мастакоў. Сярод лепшых названы прозвішчы выкладчыкаў факультэта: В. К. Дзежыц, Р. П. Клікушын, І. М. Сталяроў, Д. П. Генеральніцкі і іншыя.

У гэты час расце цікавасць чытачоў газет і да творчасці лепшых студэнтаў. Таму “Настаўніцкая газета” (20 чэрвеня 1962 г.) дае карэспандэнцыю “Выстаўка графікі”. “Галоўная тэма работ юных мастакоў – наша сучаснасць. Да найбольш удалых трэба аднесці творы «На нафтабудзе» В. Пацевіча, «Віцебск будуецца» А. Ісачанкава і М. Ніканоркава, «Будаўніцтва сельскай электрастанцыі» Н. Азарава і інш. Гэтыя работы вызначаюцца мастацкай задумай, добрай тэхнікай выканання.

Як па кампазіцыі, так і па колеру цікавыя лінагравюры студэнта 3-га курса Н. Азаранкі. Арыгінальныя і дасканала выкананы многія работы А. Ісачэнкава. Маладым задорам вее ад работ А. Мейлуна. У яго гравюр «Рыбаловы», «На возеры», добры малюнак, удалыя колеравыя рашэнні”. Азначаецца, што “студэнты А. Міхаленя, В. Апанасевіч, А. Жукава і другія паспяхова працуюць у галіне кніжнай графікі. З гэтай серыі работ, прадстаўленых на выстаўцы, звяртае на сябе ўвагу як задумай, так і добрым выкананнем афармленне кнігі «Ціхі Дон», зробленае студэнтам 3-га курса А. Міхаленем”.

**Першы выпуск на факультэце.** Ці не першым паведамленнем аб першым выпуску закончыўшых мастацка-графічны факультэт стаў артыкул “Новы атрад настаўнікаў”(“Віцебскі рабочы”, 8 ліпеня 1962 г.). “Першы выпуск у інстытуце зрабіў мастацка-графічны факультэт. Яго закончыла больш за 40 чалавек. Цікавымі былі

Рэпазіторый ВДПУ

дыпломныя работы па чарчэнню і кампазіцыі. З 24 студэнтаў, абараніўшых дыпломныя работы па чарчэнню, 5 атрымалі выдатныя адзнакі, 13 – добрыя. Па кампазіцыі адной з лепшых работ быў назван эскіз выпускніка А. Марачкіна «На мірных дарогах» (кіраўнік І. М. Сталяроў). Эскіз цікавы як па задуме, так і па колераваму рашэнню. Навізной адрозніваюцца работы А. Аляксеева «На будаўніцтве чыгункі», Ф. Гумена «Зваршчыкі судаверфі», В. Гарнашэвіча «Штрафны», А. Дарагакупца «Завочніца», Э. Бодэ «У калгас на наваселле». Усе выпускнікі атрымалі накіраванні ў школы рэспублікі і будуць там выкладаць маляванне і чарчэнне”.

Да вынікаў абароны дыпломных работ у 1963 годзе (другі выпуск на факультэце) звярнуўся “Віцебскі рабочы” 7 ліпеня ў матэрыяле “Тэма: гераіка нашых дзён”. “Ярка свеціць веснавое сонца. Чыстае паветра напоўнена водарам палявых кветак. Застыла на час удалечыні цела трактара. Нішто не парушае ні цішыню веснавога мірнага дня, ні кароткі абед трактарыста. Радасцю асветлен юны твар дзяўчынкі, якая збірае тут жа кветкі. Спакойна працякае гутарка трактарыста з сямігадовым сынам. І толькі ўзгорачак бліндажа ды абломкі металу напамінаюць аб слядах мінулай вайны. Такі кароткі змест дыпломнай работы студэнта-выпускніка мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута А. Т. Марчука, названай ім «Мірныя дні».

А. А. Алонцаў паспяхова абараніў дыплом, тэмай якога была стваральная праца савецкіх людзей. Выпускнік Н. С. Азаронак добра раскрыў гераічныя будні нафтабудаўцаў. Абарона дыпломаў выпускнікамі мастацка-графічнага факультэта вызначалася разнастайнасцю тэматыкі, добрым маляўнічым выкананнем, удалым кампазіцыйным рашэннем. Старшыня дзяржаўнай экзамецыйнай камісіі, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В. П. Сухаверхаў даў работам па жывапісе высокія адзнакі.

Вялікі поспех выпаў і на долю тых, хто абараняў дыпломныя работы па чарчэнню. Амаль палова з іх атрымала выдатныя адзнакі. І гэта заслужаны поспех. У працах выпускнікоў Р. А. Асіповіча, Л. Е. Губарэвіча, Ф. А. Ярошчанкі і іншых дадзена вычарпальная паўната выкладання даследаванага пытання, добрае графічнае афармленне нагляднага матэрыялу. Работы дыпламантаў Л. С. Анцімонава і Г. І. Маскалькова дзяржаўнай камісіяй прызнаны прыймальнымі да ўкаранення ў практыку школы і рэкамендаваны да друку.

Практычны характар насіла графіка, якая выканана студэнткамі А. Г. Міхаленяй і А. Ц. Жукавай. Вельмі важна адзначыць, што многія работы па чарчэнню былі зроблены выпускнікамі на базе СКБ-13, станкабудаўнічага завода імя Кірава, абутковай фабрыкі «Чырвоны кастрычнік», швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», аблпраекта і інш. Кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў аказалі студэнтам вялікую дапамогу ў падборы практычнага матэрыялу”.

Аб першым выпуску на мастацка-графічным пісалі таксама газеты “Звязда” (“Месца нараджэння дыпломнай – завод” (8 кастрычніка 1963 г.), “Віцебскі рабочы” (“Тэма дыпломных – сённяшні дзень” (12 чэрвеня 1965 г.) і іншыя выданні.

Да тых задач, якія трэба вырашыць факультэту, “Настаўніцкая газета” звярнулася праз артыкул “Праблемы аднаго факультэта” (11 верасня 1963 года) з асноўнай мэтай, каб “хібы, нават самыя нязначныя, не перашкаджалі самаму галоўнаму – падрыхтоўцы для школы кваліфікаваных настаўнікаў”.

19 красавіка 1967 г. віцебская абласная газета “Віцебскі рабочы” надрукавала разгорнуты матэрыял, прысвечаны першай справаздачнай выставе работ мастакоў-выкладчыкаў Віцебскага педагагічнага інстытута – “Творчыя работы мастакоў-педагогаў”. “Пэндзаль, пяро, разец, упісаныя ў контур палітры. Гэта эмблема першай справаздачнай выстаўкі работ мастакоў-педагогаў Віцебскага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. Наша знаёмства з ёй адбылося яшчэ да наведвання выставачнай залы. Выразаная з лінолеуму і перанесеная ўмелымі рукамі мастака з формы на вокладку запрашальнага білета, эмблема прыцягвала сваёй прастатой і стрыманасцю, схіляла да чагосьці строгага, сур’ёзнага, акадэмічнага.

Выставачная зала па вуліцы Леніна перапоўнена. Тут сабраліся не толькі тыя, каму належаць карціны, гравюры, скульптуры, але і тыя, хто выхоўваецца на гэтых творах, хто прагна ўглядаецца ў кожны мазок, кожны штрых, кожны злепак, зроблены рукой настаўніка. Кожны ўдзельнік ведаў: работы будзе ацэньваць не проста глядач, а твой вучань, твой выхаванец. Значыць, выстаўка – гэта не толькі экзамен на сталасць, але і экзамен на права насіць высокае званне мастака-педагога, вучыць і выхоўваць, на права перадаваць свой вопыт маладым. Ад таго, якім цябе ўбачаць тут, на выстаўцы, будзе залежаць твой аўтарытэт там, у інстытуце, на занятках у майстэрнях і кабінетах. І, забягаючы наперад, хочацца сказаць, што гэты экзамен нашы мастакі вытрымалі з гонарам.

Не першы год выстаўляюцца работы члена Саюза мастакоў загадчыка кафедры малюнка і жывапісу Р. П. Клікушына. І цяпер яго творы – сведчанне сталасці, высокага майстэрства. Выстаўленыя ім трыпціх «Вясна» («Вярба», «Пейзаж», «Падснежнік»), гравюра «Пейзаж з сонцам» з трыпціха «Радзіма», рад гравюр з серыі «Віцебскія ўскраіны»

Рэпазіторый ВГУ

прасякнуты глыбокім лірызмам, паэтычнасцю, прыгажосцю.

Гэтая ж улюбёнасць у прыроду Прыдзвіння характэрна і для другога нашага мастака, старшага выкладчыка, кандыдата ў члены Саюза мастакоў І. М. Сталярова. Удзельнік партызанскага руху, ён у сваіх эцюдах і пейзажах імкнецца адлюстраваць мясціны, звязаныя з легендарнымі дзеяннямі Першай Беларускай партызанскай брыгады Бацькі Міная. Усе яго работы з серыі «На партызанскіх сцежках» пасобаму адчуты і асэнсаваны аўтарам. У той жа час яны блізкія і зразумелыя кожнаму гледачу.

Даволі выразныя і характэрныя акварэлі кандыдата ў члены Саюза мастакоў, выкладчыка Ф. Ф. Гумена. Гэты мастак арыгінальны. У яго работах на дзіва спалучаецца і ўжываецца старое (пейзажы з архітэктурнымі помнікамі Чарнігава, Віцебска і іншых гарадоў) і новае, як, напрыклад, эцюд «Новы Полацк». Ф. Ф. Гумен умее па-свойму бачыць натуру і перадаваць у фарбах стан прыроды, настрой, ігру святла, колер.

Двое з нашых выкладчыкаў – Е. К. Красоўскі і член Саюза мастакоў В. І. Ральцэвіч дэманструюць на выстаўцы шэраг работ, прывезеных з творчай камандзіроўкі на Далёкі Усход і Камчатку. Бадай, ля гэтых карцін больш за ўсё ўзнікае спрэчак. Многія з эцюдаў і пейзажаў мастакоў даволі своеасаблівыя і па тэхніцы, і па жывапіснаму вырашэнню. Аб іх можна гаварыць асобна. Але бясспрэчна адно: некаторыя замалёўкі аўтарам удаліся. У іх ярка адлюстравана суровасць прыроды Камчаткі, непаўторная прыгажосць яе пейзажаў. На жаль, глядач не можа пазнаёміцца з усімі добрымі работамі, прывезенымі мастакамі з камандзіроўкі. Яны адабраныя для паказу на спецыяльнай выстаўцы ў Мінску.

Адно з цэнтральных месц належыць сюжэтнаму эскізу П. Н. Арцёмава «Працоўныя будні». Сама карціна будзе паказана пазней. Аднак прадстаўленыя эскізы для работы сведчаць аб сур'ёзнасці задумы маладога мастака.

Радуюць гледача і шматлікія скульптуры старшага выкладчыка Д. П. Генеральніцкага. У выставачнай зале прадстаўлены толькі некаторыя яго работы – «Піянер», «Яфрэйтар», «Рацыяналізатар», «Настаўнік» і іншыя. У многіх з іх адчуваецца настойлівае імкненне скульптара да абагульнення, да ўнутранай характарыстыкі вобраза.

Зразумела, цяжка ахарактарызаваць кожнага мастака, выставіўшага свае творы на суд гледача, як немагчыма іх хоць бы пералічыць. У залах жа экспануецца больш за 150 работ. Аднак нельга прайсці міма шэрагу ўдалых, з душой напісаных пейзажаў маладога мастака, выпускніка нашага факультэта, Л. С. Анцімонава («Пахмурны дзень», «Бярозы», «Пажар, 1941 г. » з трыпціха «Вайна» і інш.). Нельга не назваць стрыманыя, але лёгкія і эмацыянальныя нацюрморты старшага выкладчыка С. Х. Далматава; выразныя, удалыя па выкананню аўталітаграфіі і эцюды старшага выкладчыка В. Р. Шаталава («Масква» і інш.).

На выстаўцы прадстаўлены таксама шэраг цікавых эцюдаў А. В. Гаўрушка, якія будуць выкарастаны мастаком пры падрыхтоўцы пейзажа «Віцебшчына»: работы маслам (пейзажы) і нацюрморты І. П. Хіцько, эскізы пано А. В. Някрасава, монатыпіі Ф. Ф. Гумена, эскізы к трыпціху аб Вялікай Айчыннай вайне О. Р. Арлова. У залах экспануюцца і работы мастакоў-прыкладнікоў. Серыя гіпсавых работ з відамі горада Ульянаўска і дэкаратыўнае блюда «ХХ год вызвалення Віцебска», выстаўлены старшым выкладчыкам інстытута А. Ф. Кавалёвым.

Зразумела, не усе работы раўназначныя па задуме, мастацкаму вырашэнню і выкананню. Некалькі збядняе экспазіцыю адсутнасць жанравых палотнаў – яны будуць экспанавацца пазней, на юбілейнай выстаўцы мастакоў Віцебшчыны. Абмежаванасць выставачных плошчаў не дазволіла паказаць шмат работ па дэкаратыўнаму мастацтву. Гэты жанр прадстаўлены толькі адным плакатам В. Р. Шаталава. У работах нашых мастакоў не знайшоў яшчэ шырокага адлюстравання індустрыяльны пейзаж беларускага Прыдзвіння.

Аднак гэтыя недахопы не змяншаюць вартасці выстаўкі. Важна тое, што ўсе выкладчыкі факультэта працуюць творча.” Такая, даволі працяглая цытата з артыкула, здаецца нам асабліва важнай, паколькі адлюстроўвае погляды не толькі яго аўтара В. Вінаградава, які ў той час працаваў загадчыкам кафедры Віцебскага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава”.

**Заключэнне.** Падводзячы вынікі, варта адзначыць, што ўжо першыя “крокі” ў гісторыі мастацка-графічнага факультэта не толькі выклікалі вялікую цікавасць грамадскасці, знайшлі адлюстраванне ў рэспубліканскім і абласным друку, але і прадэманстравалі значнасць і высокую запатрабаванасць спецыялістаў, падрыхтоўкай якіх займаўся гэты факультэт. А яшчэ сродкі масавай інфармацыі звярнулі ўвагу і на факт актывізацыі творчай дзейнасці ў Віцебску, на з'яўленне новай плеяды маладых творцаў, якія ў далейшым сталі сапраўдным гонарам славутай Віцебскай мастацкай школы. Прыкметна, што аўтар гэтага артыкула не толькі аказаўся адным з арганізатараў, заснавальнікаў мастацка-графічнага факультэта, але і прыклаў у канцы 1950 – пачатку 60-х гадоў вялікія намаганні, ужо як журналіст і навукоўца для папулярызацыі яго дзейнасці.

*Паступіў у рэдакцыю 23.04.2018 г.*



Рэпазіторый ВДУ